**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск

тэл. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

Проспект Победителей, 11, 220004, г. Минск

тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

18.10.2019 № 02-15/[illegible]
На № __________ от __________

Матолька А.Г.
(для інфармавання зацікаўленых)

toxa.by@gmail.com

gorodsvd@mail.ru

Аб разглядзе звароту

Разгледзеўшы калектыўны зварот адносна бел-чырвона-белага сцяга, па сутнасці пастаўленых пытанняў паведамляем наступнае.

Наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльным культурным каштоўнасцям, у тым ліку зместу геральдычных аб'ектаў, рэгулюецца заканадаўствам аб культуры і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Патрабаванні да парадку ўнясення прапаноў аб наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлены артыкулам 90 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс), згодна з якім да прапановы аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці дадаюцца:

матэрыялы фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі культурнай каштоўнасці;

абгрунтаванне неабходнасці надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Апрача Кодэкса дзейнасць па ахове нематэрыяльных праўленняў творчасці чалавека рэгулююцца Канвенцыяй ЮНЕСКА аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – Канвенцыя), да якой Рэспубліка Беларусь далучылася згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2004 № 627.

На падставе артыкула 2 Канвенцыі да нематэрыяльнай культурнай спадчыны адносяцца звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны.

Вызначальным фактарам у дадзеным выпадку з'яўляецца наяўнасць пэўнай супольнасці альбо групы людзей – носьбіту і карыстальнікаў культурнай каштоўнасці, якія прызнаюць яе ў якасці сваёй спадчыны. Менавіта праз супольнасці і групы ў межах іх навакольнага асяроддзя, ва ўзаемадзеянні з прыродай і іх гісторыяй ад пакалення ў пакаленне перадаецца нематэрыяльная культурная спадчына.

Для забеспячэння дзейнасці па фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі нематэрыяльных культурных каштоўнасцей ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь распрацаваны метадычныя рэкамендацыі, азнаёміцца з якімі можна ў электронным выданні "Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны: практычнае кіраўніцтва" (http://www.livingheritage.by/Publikacyi/Praktycznaje_kiraunictva.pdf.).

Разам з тым, у дадзеным калектыўным звароце адпаведныя матэрыялы, вызначаныя артыкулам 90 Кодэкса, прадстаўлены не ў поўным аб'ёме.

Матэрыялы фіксацыі культурнай каштоўнасці, прадугледжаныя пунктамі 5 – 8 артыкула 91 Кодэкса не змяшчаюць тэксатавага апісання зместу геральдычнага аб'екта, яго відавочныя адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і звесткі аб носьбіце нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці, адсутнічаюць матэрыялы фотафіксацыі разглядаемай каштоўнасці.

Прадстаўленая копія схематычнага выгляду бел-чырвона-белага сцяга не можа быць улічана ў якасці матэрыялаў фіксацыі. Графічне адлюстраванне павінна праводзіца згодна з пунктам 8 артыкула 91 Кодэкса.

У адпаведнасці с заключэннем ДНУ "Інстытутут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" праблема генезісу бел-чырвона-белага сцяга застаецца недаследаванай, называюцца розныя даты яго з'яўлення (1905 г., 1909 г., 1912 г., 1917 г.,). Пытанне аб тым, пад якім сцягам адбывалася стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі 9 сакавіка 1918 г. і абвяшчэнне яе незалежнасці 25 сакавіка 1918 г. патрабуе спецыяльнага дэталёвага даследавання. Ілюстрацыйнага матэрыялу аб гэтых падзеях не захавалася.

Прыведзеныя матэрыялы навуковай апрацоўкі ўтрымліваюць толькі гістарычныя звесткі, якія ўзяты з даступных айчынных выданняў, маюць фрагментарны характар і не дазваляюць сцвярджаць аб поўным аналізе прычынна-выніковай залежнасці культурнай каштоўнасці і сістэме падобных культурных каштоўнасцей і заканамернасцей яе развіцця.

Такім чынам, праведзеная навуковая апрацоўка не адпавядае патрабаванням пунктаў 9, 10,11 артыкула 91 Кодэкса.

Мастацкая ацэнка і асобнае абгрунтаванне неабходнасці надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці не прадстаўлены.

На падставе палажэнняў пункта 10 артыкула 93 Кодэкса прапанова аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, якая не адпавядае патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 90 гэтага Кодэкса, Міністэрствам культуры не можа быць разгледжана.

Па інфармацыі, прадстаўленнай дзяржаўнай установай "Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь", бел-чырвона-белы сцяг узору 1991-1995 гг., які захоўваецца ў яго фондах, быў перададзены гэтай установе прыватнымі асобамі, а не дзяржаўнымі органамі, з чаго вынікае, што дадзены сцяг не мог выкарыстоўвацца ў якасці Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь у 1991 – 1995 гг., і непасрэдна не звязаны с гістарычнымі падзеямі, якія аказалі значны ўплыў на ход гістарычнага, культурнага і (або) духоўнага развіцця беларускага народа.

Таксама паведамляем, што стварэнне каляровага эталона Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь узору 1991 – 1995 гг. не адносіцца да кампетэнцыі Міністэрства культуры.

Дадзены адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткаю першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Намеснік Міністра А.А.Яцко

Н Ходар 209 47 83